# ВОДЗЫЎ

навуковага кіраўніка па дысертацыі Мусіенкі Васіля Анатольевіча «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

Навуковая дзейнасць Мусіенкі Васіля Анатольевіча звязана з вывучэннем семантычнай дэрывацыі ў сферы ментальных намінацый, якія рэпрэзентуюцца ў лексічных сістэмах беларускай і англійскай моў. Актуальнасць даследавання вызначаецца настойлівай неабходнасцю больш глыбокага тэарэтычнага абгрунтавання і комплекснай распрацоўкі вывучэння ментальных намінацый, далейшых пошукаў прынцыпаў і метадаў сістэмнага даследавання другасных лекічных адзінак, якія ўтвараюцца па прадуктыўных спосабах словаўтварэння і ўзбагачаюць слоўнікавы склад мовы. Актуальным з'яўляецца зварот да феномена ментальнасці, які займае цэнтральнае месца ў нацыянальнай канцэптасферы любога этнасу і адлюстроўвае характар суаднесенасці простых фізічных успрыманняў аб'ектыўнай рэальнасці са складанымі і абстрагаванымі ментальнымі паняццямі. Безумоўна, актуальным з'яўляецца параўнальна-супастаўляльны падыход да ментальных намінацый, які дазволіў выявіць міжмоўныя семантычныя карэляцыі, што адлюстроўваюць адрозненні культурных, нацыянальна-гістарычных і рэлігійных уяўленняў носьбітаў розных моў, асаблівасці іх светабачання і светаразумення.

Мэтай даследавання В. А. Мусіенкі з'яўляецца выяўленне спецыфікі рэпрэзентацыі другасных ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах. У адпаведнасці з мэтай ставяцца і вырашаюцца канкрэтныя задачы, структуруецца тэкст дысертацыі. Дысертацыя В. А. Мусіенкі традыцыйна складаецца з агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. У першай главе «Катэгорыя ментальнасці ў сучаснай навуковай парадыгме» разглядаюцца пытанні, звязаныя з катэгорыяй ментальнасці, якая адлюстроўвае найбольш важныя для існасці чалавека характарыстыкі. Аналізуюцца розныя падыходы да феномена ментальнасці, выяўляецца рэпрэзентацыйная сфера гэтай катэгорыі, характарызуюцца асноўныя мадэлі ўтварэння другасных ЛСВ, якія лічацца вынікам семантычнай дэрывацыі. Другая глава «Субстантыўныя і ад'ектыўныя ментальныя намінацыі» прысвечана другасным ментальным ЛСВ, якія выяўляюцца ў сэнсавых структурах субстантываў і ад'ектываў. У трэцяй главе разглядаюцца дзеяслоўныя адзінкі, першасная семантыка якіх арыентавана на выяўленне руху, канкрэтных фізічных дзеянняў і станаў, тэмпературных, люмінальных, тэмпаральных і іншых паказчыкаў, прыстасаваных да выяўлення інтэлектуальных працэсаў і ментальна-псіхалагічных станаў чалавека.

Семантычная дэрывацыя ў дысертацыі разглядаецца як шматаспектная з'ява моўнай сістэмы, звязаная з кагнітыўнымі працэсамі чалавечага

мыслення на парадыгматычным узроўні, як асноўны інструмент катэгарызацыі і канцэптуальнай інвентарызацыі з'яў навакольнай рэчаіснасці, як найбольш пашыраны спосаб словаўтварэння, пры якім прадугледжваецца змена змястоўнай часткі значэння слова пры захаванні яго вонкавай формы. Працэс семантычнай дэрывацыі завяршаецца не толькі стварэннем новага ЛСВ, але і яго ўключэннем ў новыя кантэкстуальныя акружэнні, пашырэннем функцыянальнай нагрузкі. Менавіта па гэтай прычыне ў дысертацыі разглядаюцца сінтагматычныя адносіны, якія выяўляецца ў характары спалучальнасці шматлікіх дзеяслоўных адзінак з ментальным субстантывам *думка*.

Абраны дысертантам супастаўляльны аспект дазволіў аўтару ўстанавіць агульныя для дзвюх моў заканамернасці семантычнага развіцця ментальнай лексікі, а таксама спецыфічныя рысы ментальных семантычных дэрыватаў, акрэсліць тэматычныя групы донарскай сферы, якія паслужылі асновай для ўтварэння другасных ЛСВ рэцыпіентнай сферы. Спецыфіка ментальных і інтэлектуальных увасабленняў у беларускай і англійскай мовах заключаецца ў адрозненнях культурных, нацыянальна-гістарычных і рэлігійных уяўленняў носьбітаў розных моў, асаблівасцях іх светабачання і светаразумення, адрозненнях саміх моў, у якіх універсальныя семантычныя працэсы і агульныя мадэлі накладваюцца на структурна-сістэмную арганізацыю кожнай канкрэтнай мовы, і многімі іншымі прычынамі.

Выкарыстанне даволі значнага па аб'ёме фактычнага матэрыялу і сучасных метадаў даследавання спрыяла выразнаму размежаванню працэсаў семантычнай дэрывацыі ў субстантыўнай, ад'ектыўнай і дзеяслоўнай групах, дыферэнцыяцыі семантычных мадэлей у кожнай з груп. Некаторыя фрагменты даследавання суправаджаюцца колькаснымі падлікамі і табліцамі, якія ўзмацняюць доказную базу асноўных палажэнняў, робяць высновы максімальна канкрэтнымі. Не выклікаюць сумненняў і сфармуляваныя пункты рэкамендацый па практычным выкарыстанні вынікаў, атрыманых дысертантам.

Аспірант В.А. Мусіенка вядзе плённую публікацыйную дзейнасць. Асноўныя вынікі праведзенага дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 13 публікацыях, сярод якіх 6 артыкулаў у навуковых выданнях, якія ўваходзяць у пералік выданняў, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (2,46 аўт.л.), 6 артыкулаў у зборніках навуковых работ (1,77 аўт. л.), 1 артыкул у матэрыялах міжнародных навуковых канферэнцый (0,29 аўт. л.).

Высокая якасць працы шмат у чым абумоўлена асобай саіскальніка. Неабходна адзначыць яго працавітасць, уменне граматна і паслядоўна аналізаваць матэрыял, весці самастойны пошук, працаваць з навуковай літаратурай і выходзіць на ўзровень тэарэтычных абагульненняў. Не будзе перабольшваннем сказаць, што В. А. Мусіенка адносіцца да той катэгорыі людзей, якія характарызуюцца творчым падыходам да работы, уменнем эфектыўна планаваць і арганізоўваць сваю работу. Заняткі В.А. Мусіенкі праводзіліся на высокім навукова-метадычным узроўні з выкарыстаннем перадавога педагагічнага вопыту, сучасных інавацыйна-адукацыйных

тэхналогій. В.А. Мусіенка прымае ўдзел у сацыяльна-грамадскім жыцці калектыва, з’яўляецца членам прафсаюзнай арганізацыі, куратарам студэнцкай групы, арганізатарам шматразовых наведванняў студэнтамі БДПУ музея Вялікай Айчыннай вайны і музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Падрыхтаваная дысертацыя В.А. Мусіенкі «Семантычная дэрывацыя ў сферы ментальных намінацый: на матэрыяле беларускай і англійскай моў» з’яўляецца поўнасцю завершанай навукова-даследчай работай і адпавядае ўстаноўленым патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад’яўляюцца да такіх работ. Навуковая і навукова-педагагічная дзейнасць В.А. Мусіенкі дазваляе прысудзіць яму вучоную ступень кандыдата філалагічных навук за новыя навукова абгрунтаваныя вынікі, выкарыстанне якіх будзе садзейнічаць далейшай распрацоўцы тэарэтычных і практычных пытанняў семасіялогіі, семантычнай дэрывацыі, кампаратывістыкі, лексікаграфіі:

• першае цэласнае і комплекснае навуковае даследаванне ментальных намінацый у беларускай і англійскай мовах;

• выяўленне найбольш поўнага корпуса ментальных субстантыўных, ад’ектыўных і дзеяслоўных намінацый, іх сістэматызацыю і стварэнне на гэтай аснове першага ў лексікаграфічнай практыцы «Беларуска-англійскага тлумачальнага слоўніка другасных ментальных намінацый».

- вызначэнне асноўных семантычных мадэлей у беларускіх і англійскіх субстантыўных адзінках;

- устанаўленне крыніцы матывацыі, якія паслужылі асновай для ўтварэння рэцыпіентных ментальных ЛСВ ад’ектыўных намінацый беларускай і англійскай моў;

- выяўленне асноўных заканамернасцей і напрамкаў сэнсавага развіцця беларускіх і англійскіх дзеясловаў мыслення, пазнання, памяці, разумення і ўяўлення, а таксама спецыфікі сінтаксічнай спалучальнасці дзеяслоўных адзінак з субстантывам *думка*;

• устанаўленне спецыфікі міжмоўнага карэспандавання (суадносіны эквівалентнасці, частковага супадзення і безэквівалентнасці) другасных ментальных ЛСВ у беларускай і англійскай мовах.

Навуковы кіраўнік
доктар філалагічных навук,
прафесар В. Д. Старычонак

15 чэрвеня 2022 г.

Подпіс
сведчу. Начальнік АК БДПУ